**КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ**

**(матэрыялы для аналізу і падрыхтоўкі)**

**VIII клас**

**Заданне 1.** Знайдзіце ў кожнай пары радкоў з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» розныя словы, якія складаюцца з адных і тых жа гукаў. *(Максімальная колькасць балаў — 3.)*

| | |
|---|---|
| 1) Гракі, вароны чарадою<br>За свежай ходзяць баразною.<br>Вясёлы шум і пануканне<br>Чутны да самага змяркання. | 1) Ды гэта ж — свята, ягамосці!<br>Набок тут норавы і злосці!<br>І мяккім робіцца паганы —<br>Хоць ты яго кладзі да раны. |
| 2) О, дзядзька спосабаў меў многа<br>Даняць праціўніка малога! | 2) Грыбоў улетку тут цьма-цьмушча,<br>Народ сюды йдзе — гушчай-гушча.<br>Тут шум, тут крык, тут гоман, спевы,<br>Аж разлягаюцца ў ёй дрэвы. |
| 3) І хто з двара ў дом ні прыходзіць,<br>Пра холад гутарку заводзіць:<br>— Ну ж і мароз — аж нос зрывае! | 3) …Лажысь — пасцелька пухавая<br>І ўся агоньчыкамі ззяе!<br>Засні, сагрэйся, мой пахілы,<br>Пакуль табе прыбудуць сілы,<br>А я салодкі сон навею<br>І гожай казкаю сагрэю. |

**Заданне 2.** Выпішыце пары рускіх і беларускіх слоў, у якіх націск падае на розныя склады. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

***Узор:*** *за́ячий — зае́чы.*

Баловать — балаваць, вымерзший — вымерзлы, малый — малы, ослабление — паслабленне, переизданный — перавыданы, удить — вудзіць, усы — вусы.

**Заданне 3.** Укажыце нумары характарыстык, уласцівых сінонімам. *(Максімальная колькасць балаў — 4.)*

**1)** Адрозніваюцца націскам;
**2)** выконваюць аднолькавую сінтаксічную функцыю;
**3)** могуць быць markedрознага паходжання;
**4)** паходзяць з грэчаскай мовы;
**5)** здольныя ўтвараць рады;
**6)** выконваюць сэнсаадрознівальную функцыю;
**7)** маюць розную часцінамоўную прыналежнасць.

**Заданне 4.** Запішыце 5 слоў, якія ўтвораны пры дапамозе суфіксаў *-іх-/-ых-* і маюць значэнне ‘найменні самак жывёл і птушак’. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| № п/п | Словы |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |

| 5. | |
|---|---|

**Заданне 5.** Запоўніце табліцу, размеркаваўшы словы *батэрфляй, бейсбол, гравюра, гросмайстар, джаз, джунглі, дызель, камюніке, картэж, ландшафт, медальён, паштамт* па адпаведных групах запазычанай лексікі. *(Максімальная колькасць балаў — 6; 0,5 бала за кожнае правільна вызначанае слова.)*

| Запазычанні з англійскай мовы | Запазычанні з нямецкай мовы | Запазычанні з французскай мовы |
|---|---|---|
| | | |

**Заданне 6.** Запоўніце пропускі ў табліцы. Запішыце індывідуальнае значэнне зыходных фразеалагізмаў. *(Максімальная колькасць балаў — 5.)*

| Фразеалагізм і яго індывідуальнае значэнне | Фразеалагізм-антонім |
|---|---|
| **1)** белая костка (‘_______________________________________________ ’) | |
| **2)** хоць на воўка ўзлезь (‘_________________________________________ ’) | |
| **3**) за маліну (‘___________________________________________________ ’) | |
| **4**) пападаць пальцам у неба (‘_____________________________________ ’) | |
| **5)** адкрытым тэкстам (‘_______________________________________ ’) | |

**Заданне 7.** Вызначце тып даданых частак складаназалежных сказаў. Укажыце, што выступае сродкам сувязі паміж даданай і галоўнай часткамі (злучнік ці злучальнае слова). *(Максімальная колькасць балаў — 6; 1 бал — за тып сказа, 0,5 — за сродак сувязі.)*

1) Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! (*Ф. Багушэвіч*).
2) Якая справа, такая і слава (*Прыказка*).
3) Ніякая навука не дае агню вачам і жывога румянцу шчокам, калі халодная душа дрэмле ў прамоўцы (*М. Кашанскі*).
4) Сапраўдным настаўнікам можа быць толькі чалавек, які самаахвярна аддае душэўныя багацці і веды людзям (*Паводле В. Віткі*).

**Заданне 8.** Запішыце, якім літаратуразнаўчым паняццям адпавядаюць наступныя азначэнні. *(Максімальная колькасць балаў — 3.)*

**А)** Невялікая «ка́зачка» павучальнага характару, у якой героямі выступаюць прадстаўнікі жывёльнага свету, неадушаўлёныя прадметы, людзі. Гэтая забаўная гісторыя алегарычнага вытлумачэння з’яўляецца ілюстрацыяй да вядомага жыццёвага або маральнага правіла.

**Б)** Гэтыя вершы можна не толькі чытаць, але і разглядваць, як разглядваюць будынак або карціну. Менавіта Сімяон Полацкі «маляваў» такія вершы.

**В)** Найстаражытнейшы жанр драматычнай літаратуры. Бярэ пачатак у антычных абрадах, звязаных з культам бога вінаградарства і віна Дыяніса, які выяўляўся ў вобразе сатыра з невялікімі рожкамі і барадой. У часе рытуальнага прадстаўлення ў ахвяру Дыянісу прыносілі казла — адсюль і назва.

**Заданне 9.** Вызначце, хто з пералічаных беларускіх паэтаў з’яўляецца аўтарам прыведзенага верша. Выбар абгрунтуйце. *(Максімальная колькасць балаў — 6; 2 — за правільны адказ, 4 — за абгрунтаванне.)*

Светлыя хмаркі — дзеткі прастору —
        Ціха па небе плывуць.
Ім незнаёмы слёзы і гора,
        Смутак і жаль іх не рвуць.

Ціха і згодна ідуць, небажаткі,
        Ўсюды ім сцежкі ляжаць.
Ясныя зоркі, быццам дзяўчаткі,
        Скрозь іх валокны глядзяць.

Золатам сонца іх аблівае,
        Месяц ім срэбра дарыць,
Грозную песню ім гром напявае,
        Вецер на крыллях імчыць.

Светлыя хмаркі, рунь залатая,
        Дум небясоў чарада!
Вам незнаёма нядоля людская,
        Клопат, згрызоты, нуда.

Стэп неаглядны, шыр нелюдзіма,
        Вольнае царства вятроў, —
Там вашы сцежкі, там і радзіма,
        Дзеткі блакітных стэпоў!

Станьце ж вы, хмаркі, над рубяжамі
        Нашых палеткаў, шнуроў,
Ў сэрца людское закіньце з дажджамі
        Думкі іх верных сыноў.

**А**) Янка Купала;
**Б**) Цётка;
**В**) Якуб Колас;
**Г**) Максім Багдановіч.

**Заданне 10.** Ніжэй прыводзіцца арыгінальны тэкст класічнай рускай літаратуры і яго пераклад на беларускую мову. У асобных радках перакладу зроблены пропускі. Пастарайцеся ўзнавіць версію перакладчыка і / або прапанаваць уласную. Пры стварэнні ўласнага варыянта (варыянтаў) дазваляецца поўнасцю змяняць радок, у якім ёсць пропуск, галоўнае — захаваць мастацкую цэласнасць твора. (*Максімальная колькасць балаў — 6; па 2 балы за кожны адпаведны варыянт.)*

| | |
|---|---|
| Подруга дней моих суровых, | Сяброўка дзён маіх суровых, |
| Голубка дряхлая моя! | Галубка, ты, нібыта ў сне, |
| Одна в глуши лесов сосновых | Сярод глушы лясоў сасновых |
| Давно, давно ты ждёшь меня. | Даўно счакалася мяне. |
| Ты под окном своей светлицы | Ты пад акном _____________ |
| Горюешь, будто на часах, | Вартуеш час, нібыта страх, |

| | |
|---|---|
| И медлят поминутно спицы<br>В твоих наморщенных руках.<br>Глядишь в забытые вороты<br>На чёрный отдалённый путь:<br>Тоска, предчувствия, заботы<br>Теснят твою всечасно грудь.<br>То чудится тебе... | Марудзяць кожнае хвіліны<br>Пруткі ў наморшчаных руках.<br>І на забытыя вароты<br>Глядзіш з маркотай у вачах;<br>________________________<br>Кладуцца гнётам у грудзях.<br>То __________________... |
| А. С. Пушкін. «*Няньцы*». | Пер. *Максіма Танка.* |

## Даведкі

**Заданне 1**: 1) вароны [*вароны*] — норавы [*норавы*]; 2) многа [*многа*] — гоман [*гоман*]; 3) нос [*нос*] — сон [*сон*].

Каментарый. Прыведзеныя словы, як паказвае транскрыпцыя, складаюцца з адных і тых жа гукаў. Адрозненне — у паслядоўнасці гэтых гукаў.

**Заданне 2**: балова́ть — ба́лаваць, ма́лый — малы́, уди́ть — ву́дзіць, усы́ — ву́сы.

**Заданне 3**: 2, 3, 5, 6.

**Заданне 4**: бусл**іх**а, жураўл**іх**а, вераб'**іх**а, зубр**ых**а, бабр**ых**а...

**Заданне 5**

| Запазычанні з англійскай мовы | Запазычанні з нямецкай мовы | Запазычанні з французскай мовы |
|---|---|---|
| батэрфляй<br>бейсбол<br>джаз<br>джунглі | гросмайстар<br>дызель<br>ландшафт<br>паштамт | гравюра<br>камюніке<br>картэж<br>медальён |

**Заданне 6**

| Фразеалагізм і яго індывідуальнае значэнне | Фразеалагізм-антонім |
|---|---|
| 1) белая костка ('чалавек дваранскага паходжання') | чорная костка |
| 2) хоць на воўка ўзлезь ('зусім нічога не відаць з-за цемры') | хоць іголкі збірай |
| 3) за маліну ('есці з вялікай ахвотай, са смакам') | як на плот вешаць |
| 4) пападаць пальцам у неба ('гаварыць ці рабіць што-н. неўпапад, недарэчна') | пападаць у цэль; пацэліць у дзясятку; як у сук уляпіць |
| 5) адкрытым тэкстам ('гаварыць проста, шчыра, без хітрыкаў, не тоячыся') | за вочы |

**Заданне 7**: 1) з даданай мэты, злучнік; 2) з даданай выказнікавай, злучальнае слова; 3) з даданай умовы, злучнік; 4) з даданай азначальнай, злучальнае слова.

**Заданне 8**: А) байка; Б) фігурныя вершы; В) трагедыя (грэч. *tragōdia* літаральна азначае казліная песня, ад *tragos* — казёл і *ōdē* — песня). Адсюль і назва.

**Заданне 9:** Аўтарам верша «Хмаркі» з'яўляецца ЯКУБ КОЛАС.

**Каментарый.** Уважлівае прачытанне твора падказвае наступныя аргументы, якія можна выкарыстаць як абгрунтаванне прыналежнасці верша менавіта Якубу Коласу: вобраз хмарак — адзін з любімых вобразаў і паэтычнай (у яго ёсць тры вершы пад адной назвай: «Хмары» (1907), «Хмаркі» (напісаны ў 1908 г., надрукаваны ў 1913 г.), «Хмарка»

(напісаны ў 1910 г., надрукаваны ў «Нашай ніве» ў 1914 г.), а таксама вершы «Восень», «Думкі», «Журба палёў» і г. д.), і празаічнай творчасці пісьменніка (алегарычнае апавяданне «Хмарка»); хмаркі, як і вецер, «прастору дзеці», «сонца, неба дзеці», — з імі звязаны вольналюбівыя мары паэта. Можна трымаць чалавека за кратамі, можна турмою зрабіць цэлую краіну, але нельга скаваць думку чалавека. Вось чаму так часта сустракаюцца ў творчасці Якуба Коласа «нашаніўскага» часу аналогіі: хмаркі — думкі, хмары — воля.

**Заданне 10**

Сяброўка дзён маіх суровых,
Галубка, ты, нібыта ў сне,
Сярод глушы лясоў сасновых
Даўно счакалася мяне.
Ты пад акном ***сваёй хаціны***
Вартуеш час, нібыта страх,
Марудзяць кожнае хвіліны
Пруткі ў наморшчаных руках.
І на забытыя вароты
Глядзіш з маркотай у вачах;
***Сум, прадчуванні і турботы***
Кладуцца гнётам у грудзях.
То ***мроіцца табе***...

*Пер. Максіма Танка.*